# Новае сімвалічнае дрэва

**У пярэдадзень творчай вечарыны, 27 кастрычніка, побач з Нацыянальнай бібліятэкай у Парку пісьменнікаў ганаровы старшыня СПБ Мікалай Чаргінец пасадзіў дуб. Дарэчы, парк быў заснаваны да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Пра гэта сведчыць і памятны камень-валун з мемарыяльнай дошкай. Тады, у 2017 годзе, па ініцыятыве Мікалая Іванавіча, які з'яўляўся старшынёю СП Беларусі, і быў заснаваны Парк пісьменнікаў.**



*Фота Кастуся Дробава.*

— Мы разам з калегамі падумалі і прыйшлі да высновы, што ў нашай зялёнай сталіцы не лішнім быў бы яшчэ адзін парк. Я ўдзячны за падтрымку органам дзяржаўнага кіравання, Мінскаму гарвыканкаму, — гаворыць ганаровы старшыня СПБ Мікалай Чаргінец — Не ведаю, дзе, у якіх краінах свету яшчэ ёсць такое сакральнае месца. І прыемна, што парк жыве сваім жыццём, прыцягвае наведвальнікаў якраз паблізу Нацыянальнай бібліятэкі — самай прыгожай бібліятэкі свету.

Падзею пракаментаваў і вядомы празаік, публіцыст Сяргей Трахімёнак:

— Прыемна бачыць сёння ўсіх калег. Восеньскі дзень, высадка дрэва, высадка дуба як сімвала абароны чалавечага жыцця, моцы, трываласці, доўгажыхарства, чалавечай годнасці нас аб'яднала. Спадзяюся, мы адзіныя і ў служэнні нашай краіне, народу.

А ўвесну парк пісьменнікаў папоўніцца новай алеяй. Паэтэса і перакладчыца Іна Фралова, якая працуе ў Мінскім гарадскім аддзяленні СПБ, дамовілася з калегамі-літаратарамі з Масквы, што яны прывязуць у Мінск саджанцы дрэў спецыяльных гатункаў, якія падораць для высадкі ў Парку пісьменнікаў.

Між іншым, стала традыцыяй арганізоўваць паэтычныя чытанні, кніжныя фестывалі менавіта ў парку. Ужо прайшоў фестываль дзіцячай кнігі. У СПБ мяркуюць, што ў парку будуць ладзіцца і іншыя мерапрыемствы.

**Мікола БЕРЛЕЖ**